УДК 94(367)”10/12”

# Спусташэнне зямель Русі князямі Рурыкавічамі (XI – сярэдзіна XIII ст.)

**Кежа Ю.М.**
*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, Мінск*

*У артыкуле разглядаюцца паведамленні пісьмовых крыніц аб выпадках ваенных нападаў князёў Рурыкавічаў на старажытнарускія гарады і землі. Мэтай даследавання з'яўляецца аналіз летапіснай інфармацыі, звязанай з выпадкамі рабавання ў XI – пачатку XIII ст. старажытнарускіх тэрыторый прадстаўнікамі правячай на Русі дынастыі.*

***Матэрыял і метады.*** *Даследаванне праведзена на падставе вылучэння і аналізу дадзеных старажытнарускіх наратываў. У рабоце выкарыстаны агульнагістарычныя і спецыяльныя метады, у тым ліку параўнальна-гістарычны, гісторыка-сістэмны, метад гістарычнай антрапалогіі.*

***Вынікі і іх абмеркаванне.*** *Сярод шматлікіх работ па гісторыі Старажытнай Русі, рабаванні тэррыторый разглядаліся ў кантэксце палітычнага супрацьстаяння князёў правячай дынастыі. Пры гэтым амаль не аналізаваліся асаблівасці дзеянняў агрэсараў (старажытнарускіх князёў), якія далёка не заўсёды можна патлумачыць палітычнай прагматыкай і матэрыяльнымі выгодамі. Артыкул дазваляе вылучыць акрамя ўласна прагматычных мэт агрэсій, мэты ідэйна-сімвалічнага характару.*

***Заключэнне.*** *Ваенныя паходы Рурыкавічаў ажыццяўляліся галоўным чынам у кантэксце барацьбы за ўладу і сферы ўплыву. Апроч тыповых актаў гвалту і рабавання, войскі князёў рабуюць цэнтральныя храмы гарадоў, тым самым дэсакралізуючы і сімвалічна спусташаючы гарадскую прастору непрыяцеля. Некаторыя паходы з'яўляліся актам помсты кіраўніку за спустошаныя тэрыторыі ці за невыкананне раней заключаных дамоўленасцяў. Шэраг ваенных паходаў можна трактаваць як помсту выгнаных князёў гараджанам, калі спусташэнне гарадоў і гарадскіх наваколляў прадугледжвала нанясенне максімальнай шкоды супольнасці, якая пазбаўляла князя ўлады.*

***Ключавыя словы:*** *Рурыкавічы, старажытнарускія землі, ваенная агрэсія, рабаванне і гвалт.*

*(Ученые записки. – 2024. – Том 40. – С. 13–17)*

# Devastation of the Lands of Russia by the Rurikovich Princes (11th – Mid-13th Centuries)

**Kezha Yu.M.**
*Belarusian State University, Minsk*

*The article examines the reports of written sources about the cases of military attacks of the Rurikovich princes on ancient Russian cities and lands. The purpose of the research is the analysis of historical data related to robberies in the 11th – early 13th centuries. ancient Russian territories by representatives of the ruling dynasty in Rus.*

***Material and methods.*** *The research was carried out on the basis of selection and analysis of data from ancient Rus narratives. The work uses general historical and special methods, including comparative-historical, historical-systemic, historical anthropology methods.*

***Findings and their discussion.*** *Among the many works on the history of Ancient Rus, the looting of territories was considered in the context of the political confrontation between the princes of the ruling dynasty. At the same time, the actions of the aggressors (ancient Rus princes) were hardly considered, which cannot always be explained by political pragmatism and material benefits. The article makes it possible to highlight, in addition to the actual pragmatic goals of aggression, goals of an ideological and symbolic nature.*

***Conclusion.*** *Military campaigns of the Rurikovichs were carried out mainly in the context of the struggle for power and sphere of influence. In addition to the typical acts of violence and robbery, the troops of the princes looted the central temples of the cities, thereby desacralizing and symbolically ravaging the enemy's urban space. Some campaigns were an act of revenge against the ruler for devastated territories or for non-fulfillment of previously concluded agreements. A number of military campaigns can be interpreted as the revenge of the exiled princes by the townspeople, when the devastation of cities and urban neighborhoods meant causing maximum damage to the community, which deprived the prince of power.*

***Key words:*** *Rurikovichi (the Rurikovichs), ancient Russian lands, military aggression, robbery and violence.*

*(Scientific notes. – 2024. – Vol. 40. – P. 13–17)*

*Адрас для карэспандэнцыі:* ***e-mail: yurykezha86@gmail.com*** *– Ю.М. Кежа*

Важнае значэнне ў асэнсаванні прыроды старажытнарускіх канфліктаў мае вылучэнне і аналіз летапісных паведамленняў аб рабаванні тэрыторый, апісанні агрэсій і гвалтоўных дзеянняў, з якімі сутыкаліся жыхары гарадоў і зямель Усходняй Еўропы. У наратывах па старажытнарускай гісторыі дамангольскага перыяду (X – сярэдзіна XIII ст.) летапісныя паведамленні перадаюць шматлікую інфармацыю аб ваенных сутыкненнях і спусташэннях тэрыторыі Русі.

**Матэрыял і метады.** Даследаванне праведзена на падставе вылучэння і аналізу дадзеных старажытнарускіх наратываў – Аповесці аб мінулых гадах (пачатак XII ст. – далей АМГ), Лаўрэнцьеўскага (1377 г. – далей ЛЛ) і Іпацьеўскага (пачатак XV ст. – далей ІЛ) летапісаў, а таксама Наўгародскага першага летапісу старэйшага і малодшага ізводаў (канец XIII ст. – далей НПЛ). У рабоце выкарыстаны агульнагістарычныя і спецыяльныя метады ў тым ліку параўнальна-гістарычны, фармальна-тыпалагічны, гісторыка-сістэмны, метад гістарычнай антрапалогіі.

**Вынікі і іх абмеркаванне.** Паводле аналізу летапіснага матэрыялу, стаўленне саміх князёў Рурыкавічаў да агрэсіі на старажытнарускіх землях нельга назваць адназначным. З аднаго боку, забойства і ператварэнне ў рабоў аднаверцаў з пункту гледжання хрысціянскай свядомасці – несумненны грэх. З іншага боку, прызнаючы грахоўнасць падобнага роду дзеянняў, Рурыкавічы ў перыяд XI–XIII стст. ажыццяўляюць шматлікія ваенныя напады на старажытнарускія гарады і землі. Паведамленні летапісаў, дзе змяшчаюцца апісанні спусташэнняў і гвалту падчас гэтых нападаў, істотна пераважаюць над апісаннем ваенных набегаў на старажытнарускія тэрыторыі суседніх уладароў і народаў.

У якасці паказальнага прыкладу можна прывесці ўспаміны Уладзіміра Усеваладавіча Манамаха, якія ён пакінуў у сваім “Павучанні”. У пачатковай частцы твора князь у якасці настаўлення сваім сынам піша аб недапушчальнасці рабавання і гвалту на “сваёй” тэрыторыі: “куда же ходѧще путемъ по своимъ землѧмъ . не даите пакости дѣæти . ѡтрокомъ ни своимъ. ни чюжимъ . ни в селѣх̑ . ни в житѣх̑ . да не клѧти вас̑ начнуть” [1, стб. 246]. Далей, апісваючы ўласныя ваенныя паходы, Манамах паведамляе аб татальным спусташэнні зямель наўпрост яму не падпарадкаваных. Паказальна ў дадзеным кантэксце выглядае зніштажэнне Уладзімірам Усеваладавічам у 1084–1085 гг. Менска, а таксама яго паведамленне аб спаленні ваколіц Полацка і спусташэнні Полацкай зямлі [1, стб. 247, 248].

У большасці летапісных артыкулаў спусташэнні земляў Русі згадваюцца ў кантэксце барацьбы паміж князямі за ўладу і сферы ўплыву ў землях-княствах. У агульнай інфармацыі аб войнах паміж Рурыкавічамі можна вылучыць прымяненне наступных формаў гвалту: спаленне гарадоў і вёсак [1, стб. 303, 361; 2, стб. 487, 491, 506; 3, с. 227], забойства і (або) паланенне насельніцтва [1, стб. 314, 361, 381, 386, 469; 2, стб. 296, 739, 746, 770, 772, 774; 3, с. 214, 220, 227, 281], знішчэнне пасеваў [1, стб. 310, 378; 2, стб. 332], угон жывёлы [1, стб. 361; 2, стб. 309, 643], рабаванне маёмасці гараджан або князя [2, стб. 333, 361; 3, с. 220].

У многіх выпадках старажытнарускія князі ў якасці дадатковай сілы выкарыстоўвалі качэўнікаў полаўцаў, што ў другой палове XI–XII ст. з’яўлялася распаўсюджанай палітычнай практыкай [1, стб. 200, 226, 303, 349, 429; 2, стб. 296, 507, 508; 3, с. 284]. Апроч полаўцаў, пры спусташэнні земляў у саюзніках рускіх князёў маглі выступаць іншыя качавыя народы: берандзеі, торкі і чорныя клабукі [1, стб. 332; 2, стб. 698].

У некаторых летапісных эпізодах паходы Рурыкавічаў звязаны з пазбаўленнем горада (аб’екта агрэсіі) высокага палітычнага ці рэлігійнага статусу. У 1066–1067 гг. полацкі князь Усяслаў Брачыславіч ажыццявіў паход на Ноўгарад. У НПЛ ст. паведамляецца аб паланенні жанчын і дзяцей, разрабаванні Усяславам наўгародскай Сафіі – зняццем званоў і вывазам царкоўнага начыння: “Приде Всѣславъ и възя Новъгородъ, съ женами и съ дѣтми; и колоколы съима у святыя Софие. О, велика бяше бѣда въ час тыи; и понекадила съима” [3, с. 17]. Па ўсёй верагоднасці, храмавыя званы і царкоўнае начынне, вывезенае з наўгародскай Сафіі, знайшлі сваё выкарыстанне ў Сафійскім саборы Полацка. Прыкладна ў гэты ж самы час (60–70-гг. XI ст.) Усяславам будуецца полацкі храм святой Сафіі [4, с. 350]. Паралелі падобнага роду дзеянням знаходзяцца ў апісанні будаўніцтва царквы Багародзіцы (Дзясяціннай) Уладзімірам Святаславічам у 90-я гг. X ст. Кіеўскі князь выкарыстоўваў іконы і царкоўныя рэчы, вывезеныя з візантыйскага Корсуня, для ўпрыгожвання новапабудаванага кіеўскага храма [1, стб. 122].

Узяцце Ноўгарада Усяславам у 1066–1067 гг. акрамя выключна прагматычных мэт – паслаблення галоўнага канкурэнта ў выхадзе на Балтыку, здабычы рабоў і матэрыяльных каштоўнасцяў – мела важнае ідэалагічнае і сімвалічнае значэнне. Спусташэнне мясцовага Сафійскага сабора, які выконваў ролю духоўнага цэнтра Ноўгарада і ўсёй Наўгародскай зямлі, насіла характар разбурэння хрысціянскай прасторы гэтага горада. Верагодна, дзеянні Усяслава былі накіраваны на імкненне зрабіць Полацк адзіным рэлігійным цэнтрам Паўночнай Русі [5, с. 78; 6, с. 15].

Найбольш выразнае сімвалічнае значэнне мелі дзеянні кааліцыі князёў пры штурме і спусташэнні Кіева ў 1169 г. Паход быў арганізаваны Андрэем Багалюбскім, кіраваў ім яго старэйшы сын Мсціслаў. Пасля трохдзённай аблогі Кіеў быў узяты і падвергся разграбленню. Інфармацыя пра гэтыя падзеі найбольш поўна адлюстравалася ў ЛЛ і ІЛ. Згодна з версіяй ЛЛ, войскамі княжацкай кааліцыі былі разрабаваны цэрквы і манастыры горада, вывезена царкоўнае начынне. Мсціслаў Андрэевіч, паводле

суздальскага летапісца, выступае зброяй боскага пакарання Кіева [1, стб. 354]. У прыватнасці, у летапісе гаворыцца аб “митропольичьей неправде”, як найважнейшым граху, пад якой, хутчэй за ўсё, маецца на ўвазе царкоўны канфлікт 50-х гг. XII ст. [7, с. 36–36].

ІЛ змяшчае больш падрабязнае апісанне ўзяцце Кіева і больш дакладную інфармацыю аб яго спусташэнні. Паведамляецца аб спаленні шматлікіх цэркваў і Пячэрскага манастыра, разрабаванні сабора св. Сафіі і Дзесяціннай царквы, зняцці званоў з кіеўскіх храмаў, забойстве і паланенні насельніцтва, а таксама рабаванні маёмасці кіяўлян [2, стб. 545]. Паказальна, што пры рабаванні цэркваў летапісец згадвае аб зняцці званоў. Дадзены летапісны эпізод зблiжае апісанне ўзяцця Кіева 1169 г. з паведамленнем аб спусташэнні Усяславам Брачыславічам Ноўгарада ў 1066–1067 гг. [8, с. 32–33].

Асэнсаванні кіеўскага і суздальскага кніжнікаў, адлюстраваныя ў ІЛ і ЛЛ, істотна адрозніваюцца. Кіеўскі летапісец спусташэнне “Маці гарадоў рускіх” апісвае як трагедыю, а ўчынкі войска Мсціслава Андрэевіча параўноўвае з дзеяннямі вавілонскага цара Седэкіі пры спусташэнні Іерусаліма. У гэтым сэнсе рабаванне Кіева адпавядае апісанню ўзяцця і абразы галоўнага біблейскага горада са згадваннем канкрэтных дэталяў: забойствам жыхароў, вынасам храмавага начыння і царкоўных каштоўнасцяў (2 Пар. 36). Дзеянні па “выняцці” царкоўнай маёмасці і спусташэнні храмаў ускосна адпавядалі ідэйным памкненням Андрэя Багалюбскага, які ў перыяд свайго кіравання ва Уладзіміры на Клязьме (1158–1174) імкнуўся зрабіць свой горад новым палітычным і рэлігійным цэнтрам Русі.

Суздальскі летапісец, лаяльны да Андрэя Багалюбскага і яго сына Мсціслава, апісвае паход 1169 г. і дзеянні кааліцыйных войскаў як пакаранне кіяўлян за грахі (“за грѣхъı ихъ”). У гэтым выпадку дзеянні князёў, якія руйнавалі кіеўскія галоўныя храмы – Дзесяцінную царкву і Сафійскі сабор, цалкам карэлявалі з ідэйным абгрунтаваннем паходу, прадстаўленым у ЛЛ. Спусташэнне цэркваў і манастыроў Кіева, а таксама вываз царкоўных святыняў былі заклiканы пазбавіць Кіеў сакральнага статусу галоўнага горада Русі, фактычна знішчыўшы яго галоўнае становішча сярод іншых старажытнарускіх цэнтраў, зводзячы яго да ўзроўню звычайнага гарадскога паселішча [9, с. 25].

У 1177 г. маштабнае спусташэнне вёскі Багалюбава ва Уладзіміра-Суздальскім княстве ў саюзе з полаўцамі ажыццяўляе разанскі князь Глеб Уладзіміравіч. Акрамя разрабавання царквы Раства Багародзіцы, згадаецца аб спаленні шэрагу іншых цэркваў, спусташэнні баярскіх сёл з паланеннем баярскіх сем’яў [1, стб. 383]. Акрамя ўскладання адказнасці за бясчынствы і знішчэння хрысціянскіх святынь на полаўцаў, галоўным вінаватым у трагедыі ў Багалюбаве прадстаўлены разанскі князь Глеб: “и тако Глѣбъ кнѧзь Ба҃ разгнѣви и ст҃ую Бц҃ю” [1, стб. 383]. Спаленне Багалюбава, апроч нанясення матэрыяльнай шкоды, насіла і сімвалічнае значэнне – знішчэнне рэзідэнцыі уладзімірскага князя з галоўным храмам было заклікана, як і ў выпадку рабавання Ноўгарада ў 1066–1067 гг., і Кіева ў 1169 г., прадэманстраваць спусташэнне сакральнага аб’екта, звязанага з дзейнасцю Андрэя Юр’евіча Багалюбскага.

Некалькі спусташальных паходаў XI–XII стст. звязаны са зваротнымі дзеяннямі ў адказ на агрэсію і былі арганізаваны як акты помсты. Так, адказам на спусташэнне Ноўгарада Усяславам, стаў паход паўднёварускіх князёў Яраславічаў – Ізяслава, Святаслава і Усевалада на тэрыторыю Полацкай зямлі. У 1067 г. князямі быў спустошаны Менск. У ходзе нападу на горад, паводле АМГ, мужчынскае насельніцтва было знішчана, а жанчыны і дзеці звернуты ў рабства [1, стб. 166]. Асноўнай мэтай войска Яраславічаў было нанясенне зваротнага ўрону ўладанням Усяслава Брачыславіча. Апроч гэтага, паланенне насельніцтва дазваляла князям набыць дадатковы рэсурс у выглядзе рабоў.

Зваротныя паходы з мэтай помсты або пакарання контрагента за парушэнне дамоўленасцей ажыццяўляліся ў перыяд канфліктаў паміж князямі Полацкай зямлі і Уладзімірам Манамахам. Ва ўжо ўзгаданым “Павучанні” князь паведамляе пра спусташальны паход Усяслава Брачыславіча на Смаленск (вотчыну Уладзіміра), затым ідзе інфармацыя аб зваротным разбурэнні Уладзімірам Полацкай зямлі: “Всеславъ Смолнескъ ѡжьже . и азъ всѣдъ с Черниговци . ѡ двою коню . и не застахом҃ въ Смолиньскѣ . тѣм же путем҃ по Всеславѣ . пожегъ землю и повоєвавъ до Лукамлѧ . и до Логожьска . та на Дрьютьскъ воюѫ” [1, стб. 248].

Спусташэнне зямель праціўніка і зваротныя дзеянні як помста за нанесеную шкоду мелі месца ў працяглым супрацьстаянні за кіеўскі вялікакняжацкі стол паміж Юрыем Уладзіміравічам і яго пляменнікам Ізяславам Мсціславічам. У 1152 г. войскі Ізяслава Мсціславіча і яго саюзнікаў Ізяслава Давыдавіча і Святаслава Усеваладавіча спустошылі ўладанні Юрыя – Гарадзец Астроўскі, пры гэтым войскі кааліцыі князёў спалілі царкву Св. Міхаіла [2, стб. 446]. У адказ Юрый руйнуе некалькі гарадоў у Чарнігаўскай зямлі [2, стб. 459].

Пасля спусташэння Багалюбава ў 1177 г., чарга зваротных паходаў уладзіміра-суздальскіх князёў на Разанскую зямлю адбылася ў 1180-х – пачатку 1200-х гг. У 1187 г. уладзіміра-суздальскія князі Усевалад Юр’евіч, Яраслаў Уладзіміравіч, Уладзімір Юр’евіч і Усевалад Глебавіч узялі ў шматлікі палон і выпалілі вёскі Разанскага княства [1, стб. 407]. У 1207 г. Усевалад Юр’евіч руйнуе Разань і Белгарад Разанскі. Паход на сталіцу княства суправаджаўся спаленнем горада і паланеннем разанцаў разам з епіскапам Арсеніем [1, стб. 434]. У наступным 1208 г. адбыўся чарговы паход Усевалада Юр’евіча на Разань, які зноў скончыўся захопам і спаленнем

горада, а таксама перасяленнем яго жыхароў ва Уладзімірскае княства [3, с. 249].

Пад 1097 г. у АМГ змешчана інфармацыя аб паходзе братоў Васілька і Валадара Расціславічаў на Усевалаж – горад у Валынскай зямлі, уладаннях князя Давыда Ігаравіча. Горад быў спалены, а значная частка насельніцтва знішчана: “и наставши веснѣ приде Володарь . и Васалко на Дв҃да . и придоста ко Всеволожю . а Дв҃дъ затворисѧ Володимери . ѡнѣма же ставшима ѡколо Всеволожа . и взѧста копьєм̑ град̑ . и зажгоста ѡгнем̑ . и бѣгоша людьє ѡгнѧ . и повелѣ Василко исѣчї всѧ . и створи мщеньє на людех̑ неповиннъıх̑ . и прольæ кровь неповинну” [1, стб. 267]. Прычынай паходу стала помста Васількі за асляпленне, якое было здзейснена раней па ініцыятыве Давыда. Пры гэтым паказальна, што сам Давыд Ігаравіч не пацярпеў, хаця ў далейшым і быў пазбаўлены Уладзіміра-Валынскага княжэння. Аб’ектам гвалту стала насельніцтва горада, якое, паводле летапісца, не было вінаватае ў асляпленні Васількі (“и створи мщеньє на людех̑ неповиннъıх̑ ”). У далейшым Васілька і Уладар аблажылі Давыда ва Уладзіміры-Валынскім і дабіліся выдачы баяраў, якія параілі Давыду асляпіць церабоўльскага князя. Баяры, у наступным, былі забіты [1, стб. 268].

У 1116 г. адбыўся канфлікт паміж Уладзімірам Манамахам і менскім князем Глебам Усяславічам. Глеб у выніку ваеннага паходу спустошыў Слуцк [2, стб. 282]. Зваротнымі дзеяннямі Манамаха быў паход на Менск, у выніку якога Глеб здаецца на літасць пераможцы і заключае дамову з кіеўскім князем. У 1119 г. Глеб парушае пагадненне, здзейсніўшы напад на ўладанні Манамаха. Рэакцыяй у адказ стаў чарговы паход Уладзіміра на Менск, паланенне Глеба Усяславіча і зняволенне яго ў Кіеве, дзе ён памёр у тым жа годзе [2, стб. 285].

У шэрагу паведамленняў гаворыцца аб ужыванні гвалту ў кантэксце супрацьстаяння князёў і гарадскіх супольнасцяў. У некаторых выпадках пасля выгнання князя, зваротнымі дзеяннямі экс-кіраўніка з’яўлялася спусташэнне гарадоў і гарадскіх наваколляў, а таксама расправа над гараджанамі.

У старажытнарускіх уяўленнях гарадскія аб’яднанні асэнсоўваліся як “калектыўныя асобы”, якія маюць уладу па аналогіі з князямі [10, с. 194]. Палітычная актыўнасць насельніцтва Кіева, Ноўгарада, Полацка, Галіча ва ўзаемаадносінах з князямі выяўлялася ў розных формах. Галоўным чынам, гэта былі дзеянні, звязаныя з пазбаўленнем уладара княжэння ці наадварот, запрашэнне (“пасажэння”) князя на стол. У некаторых выпадках пасля выгнання князя, зваротнымі дзеяннямі экс-уладара з’яўлялася спусташэнне гарадоў і наваколляў, г.зн. нанясенне максімальнай шкоды супольнасці, якая пазбавіла князя ўлады.

Упершыню падобныя дзеянні ажыццявіў Ізяслаў Яраславіч у 1069 г. Распраавай над кіяўлянамі, якія выгналі князя, стала забойства і асляпленне людзей, падазроных ва ўдзеле ў паўстанні [1, стб. 173–174]. У 1144 г. галіцкім князем Уладзімірам Валадар’евічам была здзейснена расправа над жыхарамі Галіча, якія ў перыяд адсутнасці Уладзіміра падтрымалі Івана Расціславіча Берладніка. Пасля штурму горада і ўцёкаў Івана многія жыхары Галіча (хутчэй за ўсё, прадстаўнікі баярства) былі знішчаны “казнью злою” [2, стб. 317]. У 1158 г. Расціслаў Глебавіч пасля выгнання з Полацка спустошыў наваколлі горада, адводзячы жывёлу і рабоў [2, стб. 495–496]. У 1186 г. адбыўся канфлікт паміж смаленскім князем Давыдам Расціславічам і гараджанамі Смаленска, у выніку якога значная частка смаленскіх “лепшых мужоў” была знішчана [3, с. 38].

Адно з самых буйных спусташэнняў Кіева каліцыйнымі войскамі пад кіраваннем Рурыка Расціславіча адбылося ў 1203 г. Паводле інфармацыі ЛЛ, маштаб спусташэння і гвалту не быў супастаўны з папярэднімі нападамі на старажытнарускую сталіцу: “æкого же зла не было . ѿ крщ҃еньæ надъ Къıєвомь” [1, стб. 418]. Апісанне дадзеных падзей адлюстравалася ў ЛЛ і НПЛ. Паведамленне ЛЛ больш падрабязна і мае даволі выразныя біблейскія запазычанні. Узяцце Кіева параўноўваецца са спусташэннем Іерусаліма, пра якое згадваецца ў 78-псалме цара Давіда: “Боже! Приидоша языци в достояние Твое и оскверниша церковь святоую Твою, положиша Иярусолима, яко овощное хранилище, положиша троупие рабъ Твоих брашно птицам небесным, плоть преподобных Твоих – зверем земным, пролияша кровь ихъ, аки воду” (Пс. 78: 1–3). Паводле паведамлення ЛЛ, рабаванню падвергліся галоўныя кіеўскія храмы – Сафійскі сабор і Дзесяцінная царква. Спусташэнне суправаджалася зніштажэннем насельніцтва, дзе асаблівую ўвагу летапісец звяртае на забойства святароў, манахаў і манашак [1, стб. 418–419]. Некаторыя элементы паведамлення знаходзяць паралелі ў іншых летапісных артыкулах, якія апісваюць спусташэнні старажытнарускіх гарадоў. У прыватнасці, асноўны матыў – разрабаванне горада язычнікамі, з паўторамі некаторых фраз сустракаюцца пры апісанні нападу полаўцаў на Кіева-Пячэрскі манастыр у 1096 г. [1, стб. 232–234], рабаванні Кіева ў 1169 г. [2, стб. 545], і спусташэнні манголамі Уладзіміра на Клязьме ў 1238 г. [1, стб. 463–464].

Прычынай нападу на Кіеў 1203 г. сталі падзеі гадавой даўніны, калі Рурык Расціславіч быў выгнаны з кіеўскага княжэння сваім зяцем Раманам Мсціславічам. Кіяўляне, насуперак волі Рурыка адчынілі Раману гарадскую браму. Пачатак аблогі Кіева Рурыкам адбываецца у дзень уласных імянін, бо князь быў ахрышчаны ў гонар св. Васілія Кесарыйскага і на 1 студзеня прыпадае дзень памяці гэтага святога [11, с. 603]. Узяцце і рабаванне Кіева было абумоўлена не толькі імкненнем вярнуць сабе горад. Спусташэнне Кіева з’яўлялася своеасаблівай помстай кіяўлянам, якія пасля многіх гадоў княжэння Рурыка пагадзіліся прыняць яго апанента Мсціслава Уладзіміравіча [12, с. 165].

**Заключэнне.** Прааналізаваўшы згаданыя ў летапісах выпадкі ваенных нападаў на старажытнарускія гарады і землі, а таксама дзеянні, якія гэтыя напады суправаджалі, мы можам адзначыць некаторыя асаблівасці ажыццяўлення ваенных агрэсій унутры старажытнарускіх зямель дамангольскага перыяду.

Ваенныя паходы на старажытнарускія землі князёў Рурыкавічаў ажыццяўляліся галоўным чынам у кантэксце барацьбы за ўладу і сферы ўплыву. Як правіла, вынікам ваенных нападаў станавіўся захоп рабоў, жывёлы і харчавання, што дазваляла нападаючаму боку істотна папоўніць свае эканамічныя рэсурсы. У шэрагу выпадкаў дадзеныя вайсковыя кампаніі суправаджаліся знішчэннем мясцовага насельніцтва.

Пры спусташэнні Ноўгарада ў 1066–1067 гг., узяцці Кіева ў 1169 г. і нападзе на Багалюбава ў 1177 г., дзеянні нападаючых князёў насілі яскрава выражаны сімвалізм. Апроч тыповых актаў гвалту і рабавання (знішчэнне і паланенне насельніцтва, захопу каштоўнасцяў), войскі князёў рабуюць цэнтральныя храмы гарадоў, тым самым дэсакралізуючы і сімвалічна спусташаючы гарадскую прастору непрыяцеля.

Некаторыя паходы з'яўляліся актам помсты кіраўніку за спустошаныя тэрыторыі ці за невыкананне раней заключаных дамоўленасцяў. Шэраг ваенных паходаў можна трактаваць як помсту выгнаных князёў гараджанам, калі спусташэнне гарадоў і гарадскіх наваколляў прадугледжвала нанясенне максімальнай шкоды супольнасці, якая пазбаўляла князя ўлады.

## Літаратура


1. Полное собрание русских летописей: в 10 т. – Ленинград: Изд-во Академии наук СССР. – 1926–1928. – Т. 1. Лаврентьевская летопись. – 379 с.
2. Полное собрание русских летописей: в 10 т. – СПб.: Типография М.А. Александрова, 1908. – Т. 2. Ипатьевская летопись. – 638 с.
3. Новгородская первая летопись старшего и младшего изводов. – М.: Изд-во Академии наук СССР, 1950. – 576 с.
4. Торшин, Е.Н. О строительных материалах Софийского собора в Полоцке и проблеме датировки памятника / Е.Н. Торшин // Труды Государственного Эрмитажа: Первые каменные храмы Древней Руси: материалы архит.-археол. сем-ра, Санкт-Петербург, 22–24 нояб. 2010 г. / науч. ред. Д.Д. Ёлшин. – СПб.: Изд-во Гос. Эрмитажа, 2012. – С. 337–352.
5. Кежа, Ю.Н. Когда Волхов течёт вспять. Поход князя Всеслава на Новгород 1066 г. / Ю.Н. Кежа // Родина. – 2013. – № 5. – С. 76–78.
6. Емяльянаў, С.П. Рэлігійныя і палітычныя стратэгіі на еўрапейскай Поўначы X–XII стагоддзяў / С.П. Емяльянаў // Веснік Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта. Серыя А. Гуманітарныя навукі. – 2015. – № 1 – С. 13–17.
7. Ковалёв, А.В. Военные кампании Андрея Боголюбского и их идеологическое оформление в летописании / А.В. Ковалёв // Studia Historica Europae Orientalis = Исследования по истории Восточной Европы: науч. сб. Вып. 3. – Минск: РИВШ, 2010. – С. 30–43.
8. Кежа, Ю.Н. «И колоколы съима у Святые Софие»: снятие храмовых колоколов в Древней Руси / Ю.Н. Кежа // Веснік Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта. Серыя А. Гуманітарныя навукі. – 2023. – № 2(67). – С. 30–35.
9. Гайденко, П.И. Крушение мечты о Владимирской митрополии (о причинах церковно-политической неудачи Андрея Боголюбского) / П.И. Гайденко // История: факты и символы. – 2020. – № 1(22). – С. 35–50.
10. Лукин, П.В. Новгородское вече / П.В. Лукин. – М.: Индрик, 2014. – 608 с.
11. Литвина, А.Ф. Выбор имени русских князей в X–XVI вв. Династическая история сквозь призму антропонимики / А.Ф. Литвина, Ф.Б. Успенский. – М.: Индрик, 2006. – 904 с.
12. Литвина, А.Ф. Династический мир домонгольской Руси / А.Ф. Литвина, Ф.Б. Успенский. – СПб.: «Издательство Олега Абышко», 2020. – 432 с.


*Паступіў у рэдакцыю 16.09.2024*